

# Таццяна ЛАЗАРЧЫК

Лазарчык Таццяна Леанідаўна, нарадзілася 22 жніўня 1974 года ў вёсцы Студзенікі Свіслацкага раёна Гродзенскай вобласці. У 1997 годзе скончыла Гродзенскі медыцынскі інстытут і была накіравана на працу ў горад Ваўкавыск Гродзенскай вобласці. У гэтым горадзе жыве і цяпер. Працуе ўрачом-тэрапеўтам (загадчыцай тэрапеўтычнага аддзялення) Ружанскай гарадской бальніцы. Вершы піша з дзяцінства. З 2002 года творы рэгулярна публікуюцца на старонках раённай газеты «Наш час» Ваўкавыскага раёна, а з 2017 года і на старонках газеты «Раённыя будні» Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці. Мае два выдадзеныя зборнікі вершаў: «Шёл рассвет по земле», які выйшаў у свет у 2016 годзе і «Дорога домой» – у 2018 годзе. Неаднойчы выступала з творчымі вечарамі ў бібліятэках Ваўкавыскага і Пружанскага раёнаў. У 2020 годзе Таццяна Лазарчык стала фіналістам V Міжнароднага фестывалю-конкурсу паэзіі і паэтычнага перакладу «Берега дружбы» (Растоўская вобласць, Расія). Замужам. Мае двух сыноў. Піша на рускай і беларускай мовах. З 2021 года паэтэса ў шэрагах Саюза пісьменнікаў Беларусі.

***

Абдымаю цябе
Праз пакуты дрыжачых павек
І біенне ўшчэнт
Безжалосна разбітага сэрца.
    Без  кахання, відаць,
    Не жыве на зямлі чалавек.
    Без кахання яму
    Побач з сонцам ужо не сагрэцца.

Абдымаю цябе
Праз трывожныя гукі вятроў,
Праз туманы  начныя,
Нябёсаў блакітныя далі.
    Праз хвіліны і дні,
    Праз адлегласці мацерыкоў
    Нас з табою ўначы
    Зоры, мабыць, навек абвянчалі.

Абдымаю цябе,
А душа ў набалелых грудзях,
Нібы вольная птушка,
З табою ўвырай імкнецца….
    Абдымаю цябе
    І ганю недаверлівы страх:
    Дзе б ні быў ты, з табой
    Маё сэрца заўжды застаецца!

*Лістапад 2020 г.*

***

Варажыла ў думках і без слоў,
Заклінала сэрцам і душой,
Клікала, здавалася, дамоў…
А ці быў ты калі-небудзь мой?

Верыла з сумненнямі ў душы,
Разважала з холадам у вачах,
Слухала, як дождж грыміць у начы,
Белай птушкай лётала ў снах.

Рэўнасць, як сініца ў руках
Білася, дзяўбла маю далонь,
Адзінота нараджала страх,
Той ляцеў наперад нібы конь…

Так нядоўга сэнс жыцця згубіць,
Так няхутка шчасце  адшукаць.
Ці не лепш пакуты адусціць
І ўсім сэрцам лёс свой пакахаць!

*Чэрвень 2021 г.*

***

Гармонь іграе недзе ў душы,
А ўвогул, адчуваю смутны боль.
І рэжа слых мне голас твой: “Пішы!”,
На вуснах сохне, закіпеўшы, соль.

Гармонь іграе: з галавы да ног
Пранізвае  расстання церпкі боль.
Ці ж мала ў жыцці было дарог?
Яшчэ адна. Ёй існаваць дазволь!

Галоўным будзе голас твой: “Пішы!”
І некалькі радкоў скупых штодзень.
Гармонь іграе недзе ў душы…
Як грэе сэрца дзён былых прамень!

І можа не прыстала гаварыць,
Бо словы – нібы птушкі ў вышыні,
Але,  дай, Божа, так жыцце любіць,
Каб ззялі ўсім любові прамяні!

*Снежань 2019 г.*

***

Знак бяды – гэта што за знак,
Чым ён можа быць для мяне?
Без асобых, відаць, адзнак,
Але тым ён важней удвайне.

Але тым ён удвайне хутчэй
Пасяляе ў сэрцы боль.
Знак бяды – свет чужых вачэй
І чужых тлумачэннеў соль.

Знак бяды – для душы прымус,
Непатрэбнасць чужых парук.
Выпадае казырны туз
З закаваных у кайданы рук.

Знак бяды – пачуццё таго,
Што праходзіць жыццё дарма:
За спіной, як заўжды, цямно,
А наперадзе – зноў зіма.

Знак бяды, ты знаёмы мне,
І няхай без другіх прыкмет,
Заставайся ў чужой вайне –
У душы маёй мір і свет!

*Чэрвень 2021 г.*

***

Клічу цябе, мой упарты
Гарэзлівы конь,
Клічу цябе, мой вясёлы
І пруткі скакун,
    Цёплы язык мне
    Гарачую ліжа далонь,
    Зноў размаўляю
    На мове чаруючых рун.

Клічу цябе, ні на што
Не падобны мой лёс,
Дзе не прапісана што,
Для чаго і па чым.
    Нават не мала ў лёсе тым
    Выліта слёз,
    Але лічу: ён дараваны
    Быў мне такім.

Клічу цябе, як вандроўнік
На стужках дарог,
Клічу цябе нібы ветразь
У моры пустым.
    Клічу цябе, адышоўшы
    За родны парог:
    Сябрам мне стань
    Безумоўным, надзейным, прастым!

*Чэрвень 2021 г.*

***

Малявала бяду
Чорнай хмарай на стужках дарог,
Рваўся змей папяровы
Наперад з натруджаных рук,
Ападалі дажджом
Сотні розных пакут і трывог,
А затым у нізкім небе заззяў
Цёплы сонечны круг.

Майстравала слана
З тых бясконцых, бязлікіх праблем,
Спрабавала бяда
Жалем церпкім узыйсці на парог.
Ды адкуль тая сіла?
Яна падымала з кален.
Разумею: відаць,
Гэтай сілай валодае Бог!

Размаўляла з бядой,
Толькі зкуль гэты голас гучаў?
У чым хацеў папярэдзіць,
Аб чым так хацеў спавядаць?
Азірнуся наўкол:
Дзе размовы тае гаспадар?
І ніяк не магу
Гэты голас ні ў чым адшукаць.

Бо, відаць, я сама
У тым павінна, што бачу наўкол,
Ці зіма, ці вясна –
Усё роўна для вечнай Зямлі.
Нездарма так плывуць
Пераможна праз буры вятроў,
Бо не могуць не плыць
Па жыцці нашых душ караблі!

*Чэрвень 2021 г.*

***

Не памятаю слоў,
А ты – нібыта сон.
Ці шчасце, ці праклен –
Выснова із высноў.

І родны, і чужы,
То полымя, то лед.
Ты хто  мне, адкажы,
Ты горач, ці ты мед?

Не памятаю сноў, -
Яны ляцяць у адказ,
Без думак і без слоў,
Усе пра нас, за нас.
Зноў вырашаць яны
Калі і чый чарод.
Ах, ці не хлусяць сны?
Іх сню каторы год!

Няпраўда, што жыццё
Не шэпча ў цішыні,
Зноў рвучы небыццё,
Як моцныя рамні,
Зрываючы вакол
Іллюзіі пакроў.
Жыццё не знойдзеш у снах,
Будзь да яго гатоў!

*Лістапад 2020  г.*

***

Ноч – гэта час паміж дзён:
Тым, што прайшоў, і што не,
Час адпачыць ад гульні,
Час цішыні на вайне.
Час, што трымае ў руках
Лейцы, каб коней суняць.
Час са спакоем у вачах,
Хопіць пакуль ваяваць.
Ноч агарнула ўвесь свет,
Хочаш таго ты ці не,
Думкі зыходзяць нанет,
Думаць нятрэба ў сне.
Бачыць нятрэба ўначы
Што прыгажосць, а што не.
Лепш пра сябе памаўчы –
Сон узрастае ў цане.
Лепш як найбольш адпачні,
Не заставайся ў былым,
У будучы дзень не глядзі,
Сцеле яго белы дым.

І непатрэбна  ў начы
Новыя песні складаць.
Ноч – адпачынак душы,
Ноч – каб сябе адшукаць!

*Чэрвень 2021 г.*

***

Паўтор за паўторам:
Чаго патрабуе жыццё?
Памылкі ўсе хорам
І граблі ўсё тыя ж -  ныццё!
І сон не прыходзіць
Ад вечных пытанняў: за што?
І думкі для сэрца
Сплятаюць тугое кашпо.

Паўтор за паўторам,
Наперад гляджу, то назад.
Адно разумею: па кругу
Матаю свой лёс.
Мількаюць імгненні
Адно за другім неўпапад,
І сэрца зноў плача,
А можа смяецца да слёз.

Паўтор за паўторам…
А трэба ўсяго разарваць
У свядомасці кволай
Бытуючы моцны матыў.
Каб песні надзеі
Каханню і веры складаць,
Каб кветкі ўзышлі
Сярод прошлага сумных магіл!

*Чэрвень 2021 г.*

***

Той мастак, што ў небе сівым
Маляваў караваны аблок,
Быў, напэўна, амаль што святым,
Клікаў дождж у назначаны срок.

І паэт, што ўмеў захапляць
Хараством непакошаных траў,
Безумоўна, святым мог бы стаць,
Ён саму прыгажосць даравай.

Музыкант, што так хораша мог
Птушак спеў у душы падхапіць,
Ён, вядома, амаль што быў Бог,
Ведаў ён, як патрэбна любіць.

Той пісьменнік, што мог спавядаць
Усе сакрэты вялікай Зямлі,
Быў, вядома, святому падстаць,
Беды з ім саўладаць не маглі.

Нездарма так люблю памаўчаць,
Клічу ў сэрца сваё цішыню,
Каб святое ў душу ўвабраць
І ўдзячнай быць кожнаму дню!

*Чэрвень 2021 г.*

***

У гэтых вачах
Чую шэпат начной цішыні.
Яны запрашаюць
Сваёй глыбінёй адпачыць.
І зноў мне здаецца,
Што шчасцем напоўнены дні,
Бо гэтыя вочы
Натхняюць з падзякаю жыць.

У гэтых вачах
Чую плёскат разбуджаных хваль,
Марской глыбіні
Растрывожаны думкамі свет.
Ах, гэтыя вочы,
Што мне не знаёмы амаль!
Яны мяне клічуць
У мар і здзяйсненняў сусвет.

І гэтыя вочы-
Звычайныя вочы твае.
У іх захаваны
Сакрэты забытых часоў.

І сонца ў іх,
Як у небе наранку ўстае,
І зоркі пяюць
Хараством незямных галасоў.

Ці можа так стацца:
Увесь свет для мяне – гэта ты,
Глыбінь і высот паднябёсных
Шчаслівы выток.
У вочы гляджу
З адчуваннем сваёй вышыні.
І сэрца пяе,
Атрымаўшы кахання глыток.

Ці можа так стацца:
Ты - кропка адліку ўсяму.
Відаць, сатварыўшы цябе,
Пра мяне ведаў Бог.
І я нездарма
У вачах безнадзейна тану,
Каб разам з табой
Подых шчасця пусціць на парог!

*Люты 2020 г.*

***

Успамін пра былое
Аднойчы захоча знайсці
Водгук свой у пагалоссі
За душу кранаючых струн.
Успамін пра былое,
Ты памяць маю адпусці,
Ты запісаны ў сэрцы
На мове няведамых рун.

Я ўжо не хаваю
Ні смутку, ні жалю, ні слёз,
Я ўжо не трымаю
Ні слоў, ні папрокаў, ні фраз,
Свежы вецер з былога
Мне поўную яснасць прынёс,
І ўжо непатрэбна
У думках тлумачыць адказ.

Упамін пра былое,
Нятрэба вяртацца назад,

Хай пустуе душа,
А над ёй нібы птушка ляціць
    Цішыня і спакой
    З цёмных думак у квітнеючы сад,
    Сад надзеі і мар,
    Сад, у якім так хацелася б жыць!

*Чэрвень 2021 г.*

***

Цябе спаткала ў каляровым сне,
Было прыгожым гэтае спатканне.
А месяц пасвіў зоркі ў акне,
І цемень мне была выратаваннем

Ад тых тваіх пранізлівых вачэй,
Ад тых нясмелых думак, спадзяванняў.
Ды толькі сэрца ўспыхнула ярчэй
Ад стольскіх незададзенных пытанняў.

Цябе спаткала ў каляровым сне –
Хвіліны незабруджаннага шчасця.
Табе шаптала: думай пра мяне,
І не адолеюць цябе напасці.

Прасіла я: трымай маю далонь,
Удвух лягчэй нам вандраваць па свету.
Імчаў нас сон, нібыта хуткі конь
У новы дзень, як раз насустрач лету.

Цябе спаткала, але ці ў сне?
Даўно пара ўжо было прачнуцца.
Прашу цябе: успомні пра мяне,
Калі захочаш у шчасце азірнуцца!

*Чэрвень 2021 г.*

***

Чакаю ў сэрца дазволу
Глытнуць цішыні,
Напіцца бязмоўнасці ранку,
Адчуць благадаць.
    Ці многа хвілін у жыцці,
    Што такому зрадні,

Калі непатрэбна нікуды
Ляцець ці спяшаць.

Чакаю у сэрца дазволу
Спыніць маналог
Тых думак, што мрояць
Над беднай маёй галавой.
Няхай не турбуюць, бо ў сэрцы
Гаворыць мой Бог,
Я вельмі ўдзячна яму
За размову са мной.

Чакаю ў сэрцы дазволу
Пра крыўды забыць,
Я му не патрэбны
Той горкай атравы глыток.
Бо сэрца павінна
Адно толькі ў свеце – любіць,
Тады назаўжды ў ім паселіцца
Праведны  Бог!

*Чэрвень 2021 г.*

***

Як лёгка будаваць сапраўдны Рай
У гэты момант, толькі не ўчарашні.
У вокнах гучны крык птушыных  зграй,
У сэрцы ціхі шэпат мар даўняшніх.

Як лёгка будаваць сапраўдны Рай,
Бо ён сапраўдны толькі на імгненне.
Ці белы студзень, ці вясёлы май –
Няма ніякага ў тым значэння.

Хвілін бывае шмат у вялікім дні,
І кожнае – блеск золата, смак казкі.
Сапраўдны Рай у лёгкасці гульні,
У свежасці ідэй, жыцця без маскі.

Забыўшы кім ты быў, кім хочаш быць,
У жыццё наўкол без смутку акунайся.
Рай будаваць, затым у Раі жыць
Цяпер пачні, на потым не згаджайся!

*Чэрвень 2021 г.*

